# ГІСТОРЫЯ ПАЎСЯДЗЁННАСЦІ Ў ЖАНОЧЫХ МЕМУАРАХ

У сувязі з агульнай гуманізацыяй навукі, папулярнасцю тэорыі паўсядзённасці, імкненнем даследаваць выяўлены ў слове пачуццёва-разумовы свет прыватнага чалавека ўсё большую ўвагу літаратуразнаўства прыцягваюць так званыя эгадакументы, да якіх звычайна адносяць дзённікі, запіскі, эпісталярыі, успаміны, мемуары.

Вывучэнне мемуарна-біяграфічнай літаратуры мае шэраг асаблівасцяў, выкліканых сінтэтычнасцю жанравай прыроды, якая вызначаецца парадаксальным спалучэннем дакументальнасці, патрабаваннямі факталагічнай дакладнасці і непазбежнай аўтарскай суб’ектнасці. Скіраванасць мемуарнага твора адначасова на гістарычны факт і мастацкасць яго выяўлення вызначае памежнае месца мемуарыстыкі паміж гістарычным выкладам і белетрыстыкай. Мяжа паміж гістарычным і літаратурным складнікамі мемуарнага тэксту патрабуе ўдумлівага асэнсавання ў кожным канкрэтным выпадку. Да сённяшняга дня метадалогія даследавання мемуарна-аўтабіяграфічных твораў выклікае палеміку, бо дваістасць жанру, патрабаванне нефікцыянальнасці і разам з тым вобразнага аднаўлення фактаў жыцця правакуе акцэнтацыю або гістарыяграфічнага, або эстэтычнага падыходу. Калі для гісторыка асноўную каштоўнасць мемуараў складае іх дакументальная дакладнасць, то літаратуразнаўцы звяртаюць увагу не столькі на факталагічную канву твора, колькі на яго мастацкія асаблівасці і эстэтычную вартасць. Пры ўсім гэтым даследчыкі падкрэсліваюць, што для цэласнага разумення аўтабіяграфічнага твора штучнае проціпастаўленне мемуараў як літаратурнага твора мемуарам як гістарычнай крыніцы недапушчальна. Варта заўважыць, што калі беларуская мемуарна-аўтабіяграфічная літаратура ХХ стагоддзя ў першую чаргу выклікае ўвагу літаратуразнаўцаў і крытыкаў, то мемуарыстыка ХІХ стагоддзя з’яўляецца «полем дзейнасці» амаль выключна гісторыкаў і крыніцазнаўцаў, што, бясспрэчна, збядняе ўяўленні пра дынаміку і разнастайнасць тагачаснага літаратурнага працэсу.

Станаўленне мемуарыстыкі як гісторыка-літаратурнага феномена пачынаецца з XVIII стагоддзя і звязана з фармаваннем гістарычнага самаўсведамлення асобы, выспяваннем ідэі асабістай аўтаноміі ў грамадскім і культурным жыцці. На ХІХ стагоддзе прыпадае «класічны» перыяд развіцця мемуарна-аўтабіяграфічнай літаратуры, складанне асноўных жанравых прынцыпаў і характарыстык, сярод якіх традыцыйна вылучаюць

асабовы пачатак, рэтраспектыўнасць і памяць. «Мемуары – аповед пра мінулае, заснаваны на асабістым вопыце і ўласнай памяці аўтара», – такую лаканічную фармулёўку даў адзін з першых даследчыкаў рускай мемуарнай літаратуры XVIII–XIX стагоддзяў А. Тартакоўскі [6, с. 9].

Сярод успамінаў, пакінутых нам былымі паўстанцамі, удзельнікамі вайсковых кампаній, знанымі пісьменнікамі, навукоўцамі, годнае месца займаюць творы жанчын-мемуарыстак: Ганны з Рэйтанаў Герыч (1789–1857), Евы з Вяндорфаў Фялінскай (1793–1859), Альжбеты з Рудамінаў Пакаш (1804–пасля 1860-х), Габрыэлі з Гюнтэраў Пузыні (1815–1869), Алены Скірмунт (1827–1874). Аўтабіяграфічная проза названых аўтарак у выніку гендарных асаблівасцяў вылучаецца сярод корпуса мемуарных тэкстаў XIX стагоддзя. Найперш, жаночыя мемуары інтравертныя па характары, адзначаны большай індывідуалізацыяй і суб'ектыўнасцю, большай эмацыянальнасцю і рэфлексійнасцю. Жанчыны-мемуарысткі не схільныя разглядаць сябе ў кантэксце значных падзей грамадска-палітычнага ці культурна-гістарычнага жыцця, а скіраваны пераважна на прыватна-асабістае і індывідуальнае. Так, напрыклад, падзеі 1812 года або Лістападаўскага паўстання, якія давялося перажыць некаторым аўтаркам мемуарных твораў, апісваюцца толькі ў той ступені, у якой яны непасрэдна закранулі іх сем'і, паўплывалі на жыццё бліжэйшых сваякоў і знаёмцаў. У прадметна-тэматычным плане жанчын-мемуарыстак найперш цікавіць адлюстраванне сямейна-бытавой сферы, стасункаў сяброўскіх і суседскіх. Гэта глыбінны, не зафіксаваны афіцыйнай гістарыяграфіяй, пласт штодзённага жыцця, які тым не менш з'яўляецца падмуркам вялікай гісторыі. Ева Фялінская сярод мэтаў сваіх мемуараў вылучае наступную: *Гісторыя безумоўна акрэсліць найбольш характэрныя рысы і асноўныя падзеі, ... але прыватная гісторыя сем'яў, з якіх складаецца агульны фон гісторыі, асабліва сем'яў, якія не знаходзіліся на першым плане гістарычных падзей, але з якіх тым не менш у сукупнасці складаецца асноўная частка народа, без сумнення патоне ў няпамяці, калі толькі пяро відавочцаў… не вырве яе з забыцця* [8, s. 8] (тут і далей пераклад наш. – *І. Б.*).

Затое плынь штодзённага бытавога жыцця ў жаночых мемуарах, як правіла, адноўлена ва ўсіх бытавых падрабязнасцях. Напрыклад, мемуары Альжбеты Пакаш, якія паказваюць традыцыйны побыт, заняткі і забавы заможнай шляхецкай сям'і, насычаны вялікай колькасцю дэталёвых апісанняў мэбліроўкі і ўбранняў пакояў, вопраткі, штодзённых і святочных жаночых строяў, з пазначэннем колеру і выкарыстанай матэрыі, сталовых сервізаў і страў, з якіх звычайна складаліся сямейныя сняданкі, абеды і падвячоркі. Ва ўспамінах А. Пакаш бытаапісальніцкія мініяцюры, насычаныя зрокавымі вобразамі, дапамагаюць аднавіць паўнавартасны, каляровы

*і* стракаты вобраз рэчаіснасці ў яе матэрыяльнай канкрэтыцы, стварыць настрой эмацыянальнай далучанасці да жыццёвых падзей аўтаркі і гераіні мемуарнага аповеду. Чытач можа лёгка ўявіць сабе па апісаннях Альжбеты Пакаш першы візіт у бацькоўскі дом яе будучага мужа Юзафа. З адлегласці часу мемуарыстка прыгадвае, як той, цырымонна кланяючыся здалёк, ідзе да яе праз залу. Пры гэтым аўтарка *бачыць сябе ў сукенцы з светла-сапфіравым верхам і кароткімі рукавамі, з стракатым трыкатажным шалікам, накінутым на плечы, як назаўтра была ў любімым ружовым муслінку, у туфліках і стужкай на поясе, з лёгкай газавай хустачкай на шыі. А была тады цалкам нябрыдкая панна Эліза* [13, *s*. 501]. Расійская даследчыца Н. Пушкарова выказала слушныя заўвагі, што менавіта жаночыя мемуарныя тэксты XIX стагоддзя, прама ці ўскосна, падштурхнулі літаратуру да пераасэнсавання грамадскіх каштоўнасцяў і арыенціраў у бок прыватнай сферы жыцця чалавека, на што ў поўнай меры адважылася толькі наступнае, XX стагоддзе [5, с. 69]. Думаецца, што гэта заўвага тыпалагічна карэктная і для твораў беларускіх мемуарыстак.

Мемуары названых аўтарак істотна адрозніваюцца паміж сабой маштабнасцю адлюстравання, сюжэтна-кампазіцыйнымі асаблівасцямі, наратыўнымі мадэлямі, але галоўная іх адметнасць у рознай ступені аўтарскай самапрэзентацыі і самапраяўленасці. Натуральна, што асабовы пачатак праяўляецца на ўсіх узроўнях мемуарнага тэксту, з'яўляецца арганізуючым фактарам, вызначае яго канцэптуальную цэласнасць, але мемуары вылучаюцца рознай мерай аўтабіяграфічнасці і аўтарскага самараскрыцця. Напрыклад, узгаданыя ўспаміны Альжбеты Пакаш паводле суадносін аўтарскага «я» і адлюстраваных падзей выразна аб'ектна-арыентаваныя (згодна з класіфікацыяй, прапанаванай калектывам навукоўцаў Тартускага ўніверсітэта, паводле суадносін аўтарскага «я» і адлюстраваных падзей вылучаюцца аб'ектна- і суб'ектна-арыентаваныя мемуары) [7]. Яны сканструяваны як шэраг мемуарных фрагментаў і эпізодаў, у якіх па-майстэрску адноўлена панарама таварыскага жыцця багатых шляхецкіх дамоў Віленшчыны, Свянцяншчыны, Лепельшчыны. Хаця яны і аб'яднаныя асобай аўтаркі, структурна арганізаваны яе біяграфічнай лініяй і абагрэтыя настальгічнымі пачуццямі, духоўна-эмацыянальны свет Альжбеты Пакаш паказаны ў іх дастаткова сціпла. Сумныя ўспаміны з нагоды раптоўнай смерці бацькі яна ўвасабляе ў лаканічныя фразы: *Колькі ж тут слёз для такой шматлікай сям'і! Які смутак шматлікіх хатніх слугаў! Дзе ж гэта апісаць!*

Па надрукаваных урыўках мемуараў Ганны Герыч таксама складана рэканструяваць характар і духоўны тып іх аўтаркі. Мемуарны тэкст у асноўным арганізаваны як серыя гістарычных партрэтаў ці нарысаў,

прысвечаных выбітным асобам: роднаму дзядзьку Тадэвушу Рэйтану, Радзівілу пане Каханку, каларытным постацям бабулі і дзядулі па матчынай лініі, дбайным гаспадарам Дактаровічаў і мястэчка Раманава на Случчыне. Буйныя мемуарныя фрагменты звязаны паміж сабой досыць сціслымі і ашчаднымі рэфлексіямі аўтаркі.

Эгадакументы, якія пакінула Алена Скірмунт, разнастайныя. Гэта найперш багаты эпісталярый і дзённік-травелог з зафіксаванымі ўражаннямі аўтаркі пра падарожжа да месца ссылкі, горад Тамбоў. У адкрытых, шчырых і вельмі асабістых лістах да мужа, блізкай сяброўкі, сваякоў і знаёмцаў у поўнай меры раскрываюцца розныя бакі характару Алены Скірмунт, вядомай мастачкі, скульптара, патрыёткі свайго краю, сведкі і ўдзельніцы падзей 1863 года. Пры гэтым лісты Алены Скірмунт дастаткова інфарматыўныя, што дазваляе аднавіць цэласны вобраз іх аўтара. Аўтабіяграфічная спадчына дайшла да чытача дастаткова незвычайным чынам: лісты і дзённікавыя запісы, «каляндарыкі», як называла іх А. Скірмунт, пасля яе смерці трапілі ў рукі знаёмага і земляка Браніслава Залескага. На іх падставе ён склаў кнігу «З жыцця літвінкі», дзе, дадаўшы свае допісы і каментарыі, змясціў эпісталярый і падарожны дзённік Алены Скірмунт. «Такім чынам, – адзначае Б. Залескі, – пані Гэлена ў нейкай ступені сама апавядае аб сваім жыцці, і гэтыя яе ўласныя міжвольныя сведчанні… лепш за самыя доўгія нашы словы адлюстроўваюць яе самабытную, узнёслую і сімпатычную асобу ва ўсёй рэчаіснасці і праўдзе» [4, с. 19–20].

Найбольш карэктныя для супастаўлення мемуарныя творы Евы Фялінскай «Успаміны з жыцця» і Габрыэлі Пузыні «У Вільні і ў літоўскіх маёнтках», блізкія па маштабнасці, шырыні ахопу рэчаіснасці, разнастайнасці і глыбіні асэнсавання выкладзенага матэрыялу, урэшце, па мастацка-эстэтычных вартасцях, якімі вылучаюцца гэтыя творы. Мемуары Фялінскай і Пузыні збліжае і тое, што гэта творы не толькі пісьменных, адукаваных, годных жанчын, якім ёсць чым падзяліцца з сучаснікамі і нашчадкамі, але гэта мемуары жанчын-пісьменніц. Літаратурны, а не дакументальна-гістарычны складнік у іх мемуарных тэкстах надзвычай моцны, і гэта адчуваецца ў эстэтычным падыходзе да мадэлявання рэчаіснасці, белетрызацыі фрагментаў, пластычнасці замалёвак, сюжэтнай арганізацыі матэрыялу, майстэрстве стварэння партрэтных характарыстык, лірычных адступленнях. Усё гэта дазваляе аднесці іх творы да літаратурнай мемуарыстыкі. Варта адзначыць, што калі творчыя здабыткі Е. Фялінскай і Г. Пузыні ў белетрыстыцы і паэзіі цікавыя для свайго часу, але дастаткова сціплыя, то менавіта мемуарная спадчына забяспечыла ім трывалае месца ў гісторыі літаратуры.